Асоба

Дэсантнік нумар адзін

27 снежня спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння актыўнага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза, стваральніка сучасных паветрана-дэсантных войскаў генерала арміі Васіля Піліпавіча Маргелава.

Ён нарадзіўся ў шматдзетнай сям'і рабочага-металурга. Радзіма бацькоў Васіля Піліпавіча — Магілёўская губерня. У пошуках лепшай долі сям'я Маргелавых пераехала ў Екацярынаслаў, але ў пачатку 1914 года вярнулася на радзіму. Пасля заканчэння шасці класаў пачатковай школы ў Касцюковічах Васіль пачаў сваю працоўную дзейнасць. Ён змяніў мноства рабочых прафесій, працаваў таксама лесніком, старшынёй рабочкама леспрамгаса ў Касцюковічах. Па камсамольскай пуцёўцы на працягу трох гадоў працаваў на шахце ў Данбасе.

У дакументальнай кнізе сына Васіля Піліпавіча Героя Расіі Аляксандра Маргелава «Дэсантнік № 1 генерал арміі Маргелаў» прыводзяцца словы легендарнага генерала: «Той, хто ні разу не пакідаў самалёт, адкуль гарады і вёскі здаюцца цацачнымі, хто ні разу не адчуваў радасці і страху свабоднага падзення, свіст у вушах, струмень ветру, які б'е ў грудзі, той ніколі не зразумее гонару і гордасці дэсантніка».

У Чырвоную Армію Маргелаў быў прызваны ў 1928 годзе. З верасня 1928 да красавіка 1931 года навучаўся ў Мінску ў Аб'яднанай беларускай ваеннай школе. Пасля яе заканчэння пачалася афіцэрская служба Маргелава ў Беларускай ваеннай акрузе: камандзірам кулямётнага ўзвода 99-га стралковага палка 33-й стралковай дывізіі ў Магілёве, камандзірам узвода, камандзірам кулямётнай роты ў Мінскім ваенным пяхотным вучылішчы. У якасці камандзіра батальёна, начальніка аддзела разведкі штаба 8-й стралковай дывізіі імя Ф. Э. Дзяржынскага капітан Маргелаў у верасні 1939 годзе ўдзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходняй Беларусі. Тут ён атрымаў першае баявое хрышчэнне, выканаўшы асобае заданне разведупраўлення Беларускага фронту здабыць у немцаў сакрэтны процівагаз. Падчас аперацыі быў паранены, шрам жа на левай шчацэ застаўся памяццю пра тыя дні на ўсё жыццё...

У гады савецка-фінляндскай вайны ў 1939—1940-м Маргелаў — камандзір асобнага разведвальнага лыжнага батальёна 596-га стралковага палка 122-й стралковай дывізіі 24-га стралковага корпуса 4-й арміі Беларускага фронту. Яго батальён здзяйсняў дзёрзкія рэйды па тылах праціўніка, ладзіў засады, наносячы саперніку вялікія страты. Падчас аднаго з іх Васіль Піліпавіч узяў у палон афіцэраў Генеральнага штаба нейтральнай Швецыі. Пасля заканчэння савецка-фінляндскай вайны маёра Маргелава прызначаюць памочнікам камандзіра таго ж палка па страявой частцы. З кастрычніка 1940 года ён камандзір 15-га асобнага дысцыплінарнага батальёна Ленінградскай ваеннай акругі. На гэтай пасадзе і сустрэў Вялікую Айчынную вайну на Ленінградскім фронце. Вопыт лыжных рэйдаў па варожых тылах успомнілі ў канцы восені 1941 года ў абложаным Ленінградзе. Маргелаву даручылі ўзначаліць сфарміраваны з добраахвотнікаў 1-ы Асобы лыжны полк маракоў Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. Шмат слаўных подзвігаў здзейснілі маракі-лыжнікі пад яго кіраўніцтвам. Марпехі, пераканаўшыся ў найвышэйшым узроўні ваеннай падрыхтоўкі, у вельмі багатым баявым вопыце камандзіра, безагаворачна палічылі яго сваім. І ў знак асаблівай прыхільнасці звярталіся да яго па-флоцку: «таварыш капітан 3-га рангу». Пад Ленінградам у канцы грознага 1941 года Маргелаў сустрэўся з ваенурачом Ганнай Куракінай, з якой прайшоў усю суровую

дарогу Вялікай Айчыннай вайны і не расставаўся да канца жыцця. Разам яны выгадавалі і выхавалі пяцярых сыноў, якіх Васіль Піліпавіч любоўна называў «мае гвардзейцы».

Пасля цяжкага ранення і лячэння ў шпіталі Маргелаў атрымаў прызначэнне на пасаду камандзіра стралковага палка 54-й арміі Ленінградскага фронту. Полк працягваў весці актыўныя баявыя дзеянні на Ленінградскім фронце, а затым на Волхаўскім.

З лістапада 1942-га гвардыі падпалкоўнік Маргелаў — на Сталінградскім фронце. Далейшы баявы шлях Васіля Піліпавіча і яго часцей пралёг ужо на захад. Пасля Маргелаў ваяваў на Паўднёвым фронце намеснікам камандзіра 3-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Злучэнне прайшло баявы шлях у кірунку Растова-на-Доне, удзельнічала ў прарыве непрыступнага «Міус-фронту», вызваленні Данбаса. У сакавіку 1944-га яго дывізія з ходу фарсіравала Дняпро і за некалькі гадзін авалодала Херсонам, а праз тыдзень камандзіру дывізіі палкоўніку Васілю Маргелаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Воіны 49-й гвардзейскай Херсонскай стралковай дывізіі прынеслі свабоду жыхарам Нікалаева, Адэсы, вызначыліся падчас Яска-

Кішынёўскай аперацыі, увайшлі ў Румынію, Балгарыю, паспяхова ваявалі ў Югаславіі, бралі Будапешт і Вену. 13 падзяк ад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага заслужыла 49-я гвардзейская Херсонская Чырванасцяжная ордэна Суворава стралковая дывізія — дывізія Маргелава!

Падчас Параду Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года баявы генерал узначаліў адзін з батальёнаў зводнага палка 2-га Украінскага фронту. Пасля заканчэння вайны Маргелаў скончыў Ваенную акадэмію. У выпускной атэстацыі адзначалася: «Тав. Маргелаў — дысцыплінаваны, валявы, рашучы і ў страявых адносінах добра падрыхтаваны генерал».

З 1948 года пачалася служба ў паветрана-дэсантных войсках — камандзірам 76-й гвардзейскай Чарнігаўскай дывізіі ў Пскове, камандзірам 37-га гвардзейскага Свірскага корпуса. Чвэрць стагоддзя — з 1954-га да 1979-га — генерал Маргелаў камандаваў паветрана-дэсантнымі войскамі, ператварыўшы іх у грозную ўдарную сілу, якая не ведала сабе роўных. Яго дэвіз: «Збілі з ног — змагайся на каленях. Не можаш устаць — лежачы наступай!» Менавіта Васіль Піліпавіч дабіўся, каб дэсантнікі насілі цяльняшкі і блакітныя берэты. Паводле сведчання былога начальніка Генеральнага штаба Маршала Савецкага Саюза Віктара Кулікова, Маргелава любілі не толькі ў ПДВ, але і ва ўсіх Узброеных Сілах. Любілі за мужнасць, асабістую адвагу, наватарскі падыход да справы. Дзецішча «Дэсантніка № 1» і па сёння з любасцю называюць «Войскі дзядзькі Васі».

Цесныя сувязі пастаянна звязвалі Васіля Маргелава з роднай Беларуссю. У сакавіку 1970-га на заснежаных палях Беларусі праведзена буйное агульнавайсковае вучэнне «Дзвіна». Тады ўсяго за 22 хвіліны 280 самалётаў Ан-12 і 4 самалёты Ан-22 за адзін вылет дэсантавалі восем тысяч дэсантнікаў і 152 адзінкі баявой тэхнікі!

У лютым 1978 года ў Беларусі адбыліся агульнавайсковыя вучэнні «Бярэзіна», дзе ад ПДВ удзельнічаў парашутна-дэсантны полк Віцебскай 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі. На вучэннях упершыню цэлая дэсантная часць дэсантавалася ў поўным складзе з тэхнікай і ўзбраеннем з самалёта Іл-76. Асабліва сяброўскія адносіны склаліся ў Васіля Маргелава з першым сакратаром ЦК КП Беларусі Пятром Машэравым, які часта бываў у дэсантнікаў, што дыслацыраваліся на тэрыторыі БССР, усяляк дапамагаў ім.

Васіль Маргелаў — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, кандыдат ваенных навук, кавалер больш як 60 савецкіх і замежных ордэнаў і медалёў. Памяць пра легендарнага генерала свята захоўваецца ў памяці нашчадкаў. Ён залічаны Ганаровым салдатам у спісы 76-й Пскоўскай дывізіі ПДВ, заснаваны ведамасны медаль Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Генерал арміі Маргелаў». У многіх гарадах былога СССР усталявана каля двух дзясяткаў помнікаў, ёсць вуліцы, школы, названыя ў гонар Маргелава. Помнікі Дэсантніку № 1 ёсць таксама ў Мінску, Брэсце і на малой радзіме генерала — у Касцюковічах. Імя Маргелава носяць Разанскае вышэйшае паветрана-дэсантнае каманднае вучылішча і кафедра ПДВ Агульнавайсковай акадэміі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Аб легендарным дэсантніку напісаны кнігі, у тым ліку серыі «Жыццё выдатных людзей», ансамблем ПДВ «Голубые береты» складзена некалькі песень. У 2008 годзе рэжысёрам Алегам Штромам зняты васьмісерыйны серыял «Дэсантны Баця», галоўную ролю ў якім сыграў савецкі акцёр Міхаіл Жыгалаў.

Многія пакаленні крылатых гвардзейцаў-дэсантнікаў, для якіх на ўсе часы сталі дэвізам словы генерала арміі Васіля Маргелава «Ніхто, акрамя нас!», выраслі на яго прыкладзе самаахвярнага служэння Айчыне.

Мікалай ШАЎЧЭНКА.

5 студзеня 1973 года ўпершыню ў сусветнай гісторыі каля Тулы была скінута БМД-1 на парашутна-платформенных сродках з дэсантнікамі ўнутры машыны. Экіпаж «Кентаўра» — камандзір падпалкоўнік Леанід Зуеў і наводчык-аператар старшы лейтэнант Аляксандр Маргелаў. Адправіўшы сына на гэты смяротна небяспечны эксперымент, камандуючы добра разумеў усю ступень рызыкі, дабрасловіў яго на рызыкоўны скачок, а пісталет зарадзіў адным баявым патронам — для сябе. Пасля ўдалага прызямлення генерал абняў сына і сказаў: «Не пасароміў, малайчына!»